*Н.Я.ШАЛУПЕНКА*

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ МОЛАДЗІ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Моладзь — самая актыўная, самая дынамічная частка любога грамадства, важны суб’ект сацыяльных змен, велізарная навацыйная сіла. Менавіта таму пытанні месца і ролі маладога пакалення ў жыцці сучаснага грамадства, ідэйных перакананняў моладзі, узроўню яе культуры, маральнага аблічча, жыццёвых планаў і сацыяльных арыенціраў маюць вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Трэба адзначыць, што ў апошнія гады ў Беларусі вялікая ўвага надаецца вывучэнню духоўнай культуры моладзі. У гэтых мэтах праводзіліся сацыялагічныя даследаванні, вынікі якіх знайшлі адлюстраванне ў публікацыях Я.Бабосава, Ю.Бубнова, Л.Гашчанкі, А.Данілава, І.Катлярова, А.Манаева, А.Русецкага і іншы вучоных.

Вывучэнне духоўнай культуры сучаснага маладога пакалення мае для беларускага грамадства асаблівае значэнне. Усё часцей вучоныя свету, у тым ліку і Беларусі, адзначаюць рэальную небяспеку светапогляднага і каштоўнаснага вакууму ў маладзёжным асяроддзі. Заўважым, што ў нашай краіне моладзь з’яўляецца адной з найбольш буйных сацыяльных груп (ва ўзроставай структуры насельніцтва Рэспублікі Беларусь моладзь складае 22%, амаль чвэрць насельніцтва краіны), якая здольна аказаць значны ўплыў на працэсы пераўтварэння эканомікі, палітыкі, культуры. Лёс духоўнай спадчыны папярэдніх пакаленняў, захаванне і развіццё культуры ў значнай ступені залежаць ад ідэалаў, маральных каштоўнасцей, перакананняў, матываў і ўнутраных установак моладзі.

Сучасная моладзь праходзіць сваё станаўленне ў вельмі складаных умовах сістэмнай трансфармацыі беларускага грамадства, пераходу яго з адной фазы эвалюцыі ў другую. Грамадскія змены выклікалі канфлікт пакаленняў, які не вычэрпваецца традыцыйным разыходжаннем “бацькоў” і “дзяцей” у поглядах на адзенне і прычоску, музычных прыхільнасцях і манеры паводзін, а закранае духоўныя асновы развіцця грамадства і асобы.

За апошнія гады ў маладзёжным асяроддзі адбыліся складаныя працэсы, якія сведчаць аб парушэнні пераемнасці ў перадачы сацыякультурнага вопыту, трансфармацыі каштоўнасцей, памкненняў, поглядаў. Сацыяльныя каштоўнасці, якімі жылі “бацькі”, у новай гістарычнай сітуацыі ў большасці выпадкаў сталі не патрэбны моладзі ні для сучаснага, ні для будучага жыцця. Маладыя людзі аказаліся ў становішчы “абарванай” сацыялізацыі: закліканыя логікай гісторыі працягваць развіццё на базе атрыманых у спадчыну духоўных каштоўнасцей, яны вымушаны, знаходзячыся ў стадыі станаўлення, удзельнічаць у выпрацоўцы новых каштоўнасцей.

Праведзеныя ў апошнія гады сацыялагічныя даследаванні дазваляюць выявіць тэндэнцыі змен акцэнтаў у сістэме каштоўнасцей беларускай моладзі. Вынікі гэтых даследаванняў сведчаць аб тым, што прыярытэтныя месцы ў сістэме каштоўнасцей сучаснага пакалення займаюць каханне, сям’я, сяброўства, матэрыяльны дастатак, высокі сацыяльны статус, кар’ера, вольны час. Сёння наяўнасць вялікай колькасці грошай цэніцца больш, чым адукаванасць, працавітасць, высокая культура. Нельга не адзначыць своеасаблівы сацыяльна-псіхалагічны феномен маладзёжнай свядомасці, у аснове якога—абагачэнне і жыццёвы поспех любым шляхам. Пры адказе на пытанне: “Як бы Вы аднесліся да таго, што нехта з Вашых знаёмых стаў зарабляць грошы незаконным шляхам?” — толькі 13% апытаных маладых людзей асудзілі незаконныя дзеянні сваіх знаёмых, 3 % — адобрылі, а большасць, 61 %, аднесліся абыякава, лічачы, што гэта іх не датычыцца [2].

Паказальным з’яўляецца нізкі ўзровень значнасці адукацыі. Адбываецца змена характару і статуса каштоўнасці “добрая адукацыя” ў іерархічнай структуры каштоўнасцей: яна становіцца своеасаблівым інструментам, прымае вузкі утылітарна-прагматычны характар. У структуры матываў атрымання вышэйшай адукацыі дамінуюць такія, як “атрымаць прафесію, якая цікавіць” (55%), “магчымасць многа зарабляць” (56%), “працаваць за мяжой” (25%), “заняць высокае грамадскае палажэнне” (24% ) [3].

Апошнія месцы ў сістэме каштоўнасных арыентацый сучаснай моладзі займаюць праца, патрыятызм, творчасць, грамадскае прызнанне. Калі ў пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя праца з’яўлялася найбольш значнай сацыяльнай каштоўнасцю, то ў постсавецкія часы яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна абясцэнілася. Праца як дзейнасць, сфера творчасці і самарэалізацыі ўступае месца каштоўнасцям грамадства спажывання. У сферы працоўнай матывацыі моладзі сёння пераважнае значэнне мае праца не змястоўная, а праца, у аснове якой матэрыяльная выгада. Большасць юнакоў і дзяўчат арыентуюць свае жыццёвыя планы галоўным чынам на матэрыяльны дабрабыт.

Як сведчаць сацыялагічныя даследаванні, вольны час маладыя людзі праводзяць у асноўным ля тэлевізараў, відэаапаратуры. Сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі сталі галоўным каналам уздзеяння на моладзь, асноўным фактарам яе сацыялізацыі, значна адцясніўшы сям’ю, вучэбныя ўстановы, грамадскія арганізацыі. У рэчышчы гэтага ўплыву спантанныя ўздзеянні на свядомасць і паводзіны індывідаў метанакіравана фарміруюць сацыяльна-маральныя імператывы, ідэалагічныя ўстаноўкі грамадства спажывання. Менавіта праз сродкі масавай інфармацыі ідзе пранікненне ў маладзёжную культуру не лепшых узораў масавай культуры. Адбываецца вестэрнізацыя, галоўным чынам амерыканізацыя, культурных патрэбнасцей і інтарэсаў моладзі. З тэлепраграм і фільмаў шчырасць, дабрыню, спагаду, патрыятызм даўно выцеснілі эротыка, насілле, усёдазволенасць, беспрынцыповасць. Кумірамі сучаснай моладзі з’яўляюцца героі баевікоў і эратычных фільмаў, што адбіваецца на паводзінах юнакоў і дзяўчат. Стэрэатыпы вестэрнізаванай масавай культуры адцясняюць на задні план класічную і нацыянальную культуру.

Асаблівую трывогу выклікае той факт, што ў апошнія гады зменшылася колькасць тых, хто любіць чытаць. Праяўляючы пэўную цікавасць да класічнай літаратуры, маладыя людзі ўсё ж аддаюць перавагу дэтэктывам, трылерам, “жаночым раманам”.

Амаль 90 % моладзі абмяжоўвае свае інтарэсы поп-музыкай. З тых юнакоў і дзяўчат, якія маюць аўдыё- і відэатэхніку, крыху больш за 5 % слухаюць класічную, 8,5 % — оперную, 1,5 % — камерную музыку, а астатнія аддаюць перавагу року, джазу, эстраднай і іншым відам лёгкай музыкі [1]. І тым не менш значная частка моладзі адчувае патрэбу ў класічнай мастацкай літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве.

Такім чынам, вызначальнай характарыстыкай сучаснай маладзёжнай культуры з'яўляецца феномен суб'ектыўнай неакрэсленасці. У структуры культурных патрабаванняў моладзі адбываюцца сур'ёзныя змены. Разам з іх абядненнем назіраюцца тэндэнцыі да прагматызму, узмацнення працэсаў стандартызацыі культурнага спажывання. Калі раней у патрабаваннях моладзі прэваліравала арыентацыя на творчыя віды дзейнасці, то сёння прыярытэты творчай дзейнасці страчаны. Адбываецца змена каштоўнасных арыентацый, многія каштоўнасці змяняюць знак “плюс” на знак “мінус”, але так званыя вечныя, агульначалавечыя каштоўнасці: каханне, сяброўства, годнасць і іншыя — захоўваюць сваё прыярытэтнае грамадскае значэнне.

Маладыя людзі – заўсёды “пакаленне надзей”. Менавіта ад моладзі залежыць будучае беларускага грамадства. Таму грамадства не можа быць абыякавым да таго, які склад жыцця і стыль паводзін выбірае моладзь, на якія каштоўнасці арыентуецца, з якімі ідэаламі і мэтамі ўступае ў жыццё.

___________

1. *Бабосов Е. М.* Прикладная социология. — Мн.: ТетраСистемс, 2001. — С. 245.
2. *Веремеева М. П. , Голубкова Н.Я., Филинская Л.В.* Белорусская молодежь на рубеже веков: взгляд социолога // Выбраныя навуковыя працы БДУ: У 7 т. / Рэдкал.: А.У.Казулін (старшыня) і інш. — Мн.: БДУ, 2001. — Т.1. — С. 262.
3. *Веремеева М.П., Голубкова Н.Я., Филинская Л.В.* Указ. соч. — С. 265.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ